Тыднёвік Магілёўскі

№ 4 (4)

11.04.97.

РЭДАКТАРСКІЯ НАТАТКІ

Трагедыя: на сцэне і за кулісамі

Непрацяглая адтэрміноўка ў справе канчатковай "інтэграцыі" Беларусі і Расіі не можа супакоіць неабыякага беларускага сэрца. Справа вырашана. Яна проста адкладзена на нейкі час, пакуль перастане быць надта відавочным той факт, што "объединение" ў адну краіну ідзе не па волі народаў і нават не ў выніку ўзважанага сумеснага аналізу геапалітычнай стратэгіі, а па волі імперскіх [illegible] у нас і ў Расіі. Сам Бог — хоць на самой справе ён супраць — штурхае ўсходнюю суседку да паглынання нашай краіны, народ якой так і не даспеў да разумення таго, што няма ў жыцці вышэйшай каштоўнасці, чым Бога. Так і не адчуў сваёй адказнасці перад папярэднімі і наступнымі пакаленнямі за добраахвотную здраду сваёй гісторыі, сваёй мове, святым сімвалам і самой будучыні. Так і не здолеў стаць народам, вартым долі не гаротнага прымака ў чужым доме, а самастойнага гаспадара ў доме сваім.

Апошні акт не адэкватнай большасцю трагедыі будзе ўмела задрапіраваны і ўпрыгожаны "усенародным шырокім абмеркаваннем". У ходзе яго з усіх тэлеканалаў, гэта няцяжка прадбачыць, адны "эксперты" будуць націскаць на славянскае братэрства і аднолькавы гістарычны лёс, другія супакойваць дармавым павышэннем узроўню жыцця да расійскага. Трэція будуць абяцаць дэмакратыю, якой падзеліцца з намі ўсходняя суседка, чацвёртыя — падкупаць вяртаннем пачуцця гонару за жыццё ў вялікай краіне "ад Брэста да Курыл". Папулярнымі будуць таксама аргументы аб аднаўленні парушаных сувязей, калектыўнай абароне ад "агрэсіўнага блоку" НАТА, аб невысокай матэрыяльнай цане аб'яднання і перавагах, што дасць "сумеснае" акцыяніраванне прадпрыемстваў і вытворчасцей. Словам, наслухаемся — толькі паспявай згаджацца.

А за кулісамі адкрытага прадстаўлення будзе ісці няўбачная барацьба — яна ўжо пачалася — прэтэндэнтаў на "агульны", але адзіны Крэмль. Прэтэнзіі на яго з боку нашага прэзідэнта і ўсёй палітычна-чырвонай апазіцыі з абедзвюх краін настолькі відавочныя цяпер для ўсіх у свеце, што нават цікава, якое ж будзе знойдзена з гэтай нетрывіяльнай сітуацыі выйсце. Было б, праўда, цікава, каб не перашкаджала разуменне таго адзінага цынізму з абодвух афіцыйных бакоў, які зблытаў і суправаджае ўсю тэму "единения".

А можа яшчэ і абыдзецца. Таму, што наш непрадказальны прэзідэнт можа пакрыўдзіцца за нейкую [illegible] асабістай інтэграцыйнай дзейнасці, перадумаць у апошні момант і яшчэ стаць "гарантам незалежнасці". Або таму, што можа нарэшце [illegible] "унутранай вайны" за Белавежжа Барыс Ельцын і перастане падыгрываць сваім "дзяржаўным патрыётам". Ці таму, што ўсю задуманую канструкцыю неасцярожна парушыць [illegible] "чырвоная" расійская апазіцыя. Проста таму, што апошняга слова не сказала яшчэ цывілізаваная Еўропа і ўплывовая ў свеце Амерыка (геапалітыка — рэч неаднабаковая). І нарэшце таму — а можа і галоўнае таму — што ў нашай краіне нарастае дэмакратычны нацыянальны супраціў дыктатуры, якая, каб уратавацца ад адказнасці за ўжо здзейсненыя і будучыя злачынствы (дыктатура па прыродзе сваёй не можа спыніцца), супраць незалежнасці і дэмакратыі, супраць законнасці і правоў чалавека гатовая сцерці з карты свету і самую сваю краіну.

Пры нашым народзе, на жаль, такое магчыма. Пры нашым народзе, на шчасце, такое можа стацца і недасягальным. Верыцца, канешне, у апошняе.

Генадзь Суднік,
рэдактар ТЫДНЁВІКА.

Дыктатура: хроніка падзей і фактаў (няпоўная)

У ноч на 12 красавіка 1995 года каля 200 узброеных (у тым ліку аўтаматамі) спецназаўцаў і міліцыянтаў уварваліся ў залу пасяджэнняў Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь, дзе знаходзіліся 19 дэпутатаў апазіцыі Народнага Фронту. "Баявы атрад" прыкрывала яшчэ безліч "ахоўнікаў парадку" на лесвіцах і ў фае. Дэпутатаў збілі, выцягнулі на двор і, расклаўшы па "варанках", адвезлі падалей ад цэнтру горада. Гэтай [illegible] акцыяй была спынена дэпутацкая галадоўка пратэсту супраць, як было сказана ў іхняй заяве, "здзеку з нашага народу, з нашай Айчыны, з Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь". Падставай для заявы і галадоўкі быў ініцыяваны прэзідэнтам рэферэндум па пытаннях, вынясенне якіх на грамадскае галасаванне не дазвалялася Канстытуцыяй.

Тады наша грамадскасць у асноўным абыякава адрэагавала на праяву прэзідэнцкай нецярпімасці да інакадумства. Амаль ніхто, акрамя нешматлікай колькасці прадстаўнікоў дэмакратычных арганізацый, публічна не абурыўся і не пратэставаў. Практычна ніякія звесткі пра антызаконныя паводзіны ўладаў не патрапілі і ў афіцыйную беларускую прэсу.

Аднак тая падзея, безумоўна, адбіла на ўсіх нас сваю пячатку. Інакш і не магло быць. Улада аб'явіла ўсяму свету і самой сабе: зараз мне ўсё дазволена. Яна перакрэсліла Закон, абразіла і сам інстытут парламентарызму і недвухсэнсоўна вызначыла шлях у адваротным напрамку — да дыктатуры.

Вось некаторыя красамоўныя "этапы большого пути" прэзідэнта і падначаленай яму каманды.

1995 год. 24 траўня. Студэнты Белдзяржуніверсітэта правялі акцыю пратэсту супраць рэферэндуму "аб мовах, сімволіцы і інтэграцыі" — АМОНам збіта каля 100 чалавек.

17 жніўня. Машыністы мінскага дэпо аб'явілі страйк з нагоды невыканання адміністрацыяй метрапалітэна калектыўнай дамовы і адмаўлення ад далейшых перамоваў. На працягу шасці дзён улады арыштавалі каля 20 актывістаў Свабоднага прафсаюза, зрабілі вобыск у офісе СПБ. Бастуючым былі адключаны хатнія тэлефоны. 22 жніўня Мінскі гарадскі суд прызнаў страйк незаконным. Па "слядах" акцыі было неабгрунтавана звольнена звыш 50 чалавек.

(Працяг на стар. 2, 3).

Запрашэнне ў светлае... мінулае

У вобласці разгарнулася кампанія па стварэнню новай маладзёжнай арганізацыі патрыятычнага кірунку ў разуменні сённяшняй беларускай улады. Нездарма моладзь адразу адрэагавала на ініцыятыву з высокіх кабінетаў, назваўшы новы маладзежны саюз Луксамолам. Усё, здавалася б, у звароце аргкамітэта па стварэнню новай суполкі запісана прыцягальна: тут вам і патрыятызм, і духоўныя і сацыяльныя каштоўнасці, і ўласцівыя моладзі інтарэсы. Сёння ў дзесятка, па меншай меры маладзёжных арганізацый, якія створаны і дзейнічаюць па ўласнай ініцыятыве, такія ж мэты і задачы. Навошта спатрэбілася яшчэ адна, да таго ж закліканая "аб'ядноўваць і ўзначаліць" маладзёжны рух? Ясна, што ў гэтым і ёсць асноўная задума ініцыятараў "зверху" — узначаліць і кантраляваць. Гэта раскусілі нават у Беларускім Саюзе Моладзі — нашчадку савецкага камсамола. Кіраўнікі Саюза выступілі супраць. А вось у сярэднім яго звяне — у раёнах, на прадпрыемствах, у навучальных установах — з супрацоўленнем прэзідэнцкай задуме значна цяжэй. Тут моладзь на віду, на яе адкрыта ціснуць з усіх бакоў. Да таго ж, як гэта заўсёды бывае, знайшліся і сярод маладых "агітатары", чые функцыянерскія амбіцыі засталіся пасля канчыны камсамола нерэалізаванымі. Так што нарэшце аргкамітэт у вобласці ўзначаліў Аляксандр Далжэўскі, які нядаўна прайграў выбары на пасаду другога сакратара абласнога камітэта БСМ. Цяпер ён з гатоўнасцю ўхапіўся за "новую справу" з мэтай, вядома, узначаліць прэзідэнцкі камсамол. Не цяжка прадбачыць, што пры новай пасадзе будуць і кабінет, і тэлефон-вяртушка, і надзейны заклад, і службовая машына.

А тым часам "непатрыятычная моладзь" усё часцей і ўсё ў большай колькасці выходзіць на вуліцы і плошчы пад нацыянальнымі сімваламі адстойваць свабоду і дэмакратыю.

А.СЕРДЗЮКОЎ.



Беларуская дзяржава — ад часоў Полацкага княства і да заваёвы Вялікага Княства Літоўскага Масквою — праіснавала амаль тысячу гадоў. Таму еўрапейцы, якія ўсю Усходнюю Еўропу ведалі як Русь, нашы землі з асаблівай павагаю называлі Белай Руссю. Спрыяла гэтаму і наша нацыянальная, дзяржаўная сімволіка. Белы сцяг з чырвоным пасам — сімвал незалежнасці, якую даводзілася бараніць і адстойваць цаною народнай крыві.

"Мы всегда будем в оппозиции"

Всякий раз при встрече с ним не устаю удивляться упорству, уверенности, мобильности —наверное, ключевым чертам этой неугомонной натуры. А, впрочем, работа у него такая, с которой благостно-умиротворенный флегматик вряд ли бы совладал.

Недавно мой собеседник —председатель Могилевской региональной организации свободных профсоюзов Сергей Ободовский —вернулся из Белостока, где ему удалось договориться об отдыхе 40 могилевских детей, родители которых входят в Свободный профсоюз. Белорусская диаспора, президент города, воевода и архиепископ обещали финансовую поддержку. А попутно с этим, при непосредственном и активном участии местной "Солидарности", была предпринята и массированная атака на могилевские власти. Именно с этого у нас и начался разговор.

— Каждый год без особых проблем облисполком заключает региональное соглашение с советом объединения профсоюзов области. Этого же действия по отношению к свободным профсоюзам мы не можем добиться уже 9 месяцев. Мотивировка отказа такая: исполком ведет переговоры и подписывает соглашение только с теми профсоюзами, которые представляют большинство трудящихся. Остальные — не трудящиеся? Это явное нарушение закона и о коллективных договорах, и закона о профсоюзах. Однако, областная прокуратура встала на сторону власти, а не закона. Если во времена КПСС власть звонила в суды, то сейчас сами судьи обращаются к власти за директивами. Вообще, за членами свободных профсоюзов в нашем городе идет настоящая "охота на ведьм".

Так вот, в Белостоке я участвовал в заседании управления региона, где единогласно было принято решение обратиться с петицией протеста к Генеральному консулу белорусского генконсультства в Белостоке. Там говорится, что управление региональной организации "Солидарности" — а этот профсоюз, как известно, член международной Конфедерации свободных профсоюзов — решительно протестует по поводу нарушения в Могилеве Конвенции-87 Международной организации труда. Речь в ней идет о свободе профсоюзов и охране их прав. Протест не ограничился Белостокской инициативой. Многие регионы "Солидарности", а всех их 38, первичные организации направили свои петиции протеста на факс облисполкома. Я надеюсь, что факс этот раскалился и напомнил Александру Куличкову, что такое профсоюзная содидарность.

Мы обратились в Международную Конфедерацию свободных профсоюзов, а она в свою очередь, будет обращаться в соответствующие организации по правам человека, в Международную организацию труда и непосредственно к Куличкову. Мы не позволим не считаться с нами.

— Сколько человек насчитывает сейчас региональная организация и по каким принципам складываются отношения между членами Свободного профсоюза?

— Нельзя сказать, что мы очень растем, — идет сильное давление, — но несмотря на это, около 30 организаций в области мы имеем. Я не хотел бы называть численность —эта информация может потом обернуться против нас разного рода спекуляциями.



Основной принцип взаимоотношений —один за всех и все за одного. Мы не даем в обиду ни одного из членов Свободного профсоюза. Еще не было случая, чтобы мы не защитили кого-нибудь, если администрация поступила незаконно. Вместе с тем мы всегда говорим: давайте работать как положено, в соответствии с законом, не нарушая трудовую дисциплину. Потому что члену Свободного профсоюза не простят ни малейшего прегрешения.

— При Свободном профсоюзе действует Клуб безработных...

— Этому клубу уже исполнился на днях год. Хотя и ему власти не давали и не дают житья. У клуба нет помещения, под него пришлось просто снять квартиру, под разными предлогами власть не предоставляет клубу места, хотя впрямую и не отказывает. Но или цену аренды объявляют для безработных, к слову, такую, что нет средств оплатить, то рядом с демократическими организациями боятся его разместить. А мотивируется отказ заботой о наших удобствах. Тем временем клуб пока не может включиться в сбор данных о безработных для компьютерного банка. Сдерживаются связи с подобными клубами и в Польше, и в Германии. Но в ожидании погоды у моря не сидим.

Недавно нас пригласила на беседу руководитель Центра занятости горисполкома и мы пришли к выводу, что нужно работать совместно. В частности, мы приняли участие в ярмарке вакансий. Будем оказывать и уже оказываем безработным правовую помощь. Разумеется, бесплатно. Кроме того, раз в неделю в клубе ведет прием психолог. В дальнейшем мы планируем превратить наш клуб именно в клубное место, куда безработный сможет придти, не ловя на себе сочувственных, а еще хуже — презрительных взглядов, выпить чаю, кофе, посмотреть телевизор, пообщаться с "коллегами", узнать новости.

— Вы занимаетесь и правозащитной деятельностью...

— Я вынужден ею заниматься. Это у нас на бумаге все красиво — и законы есть, и президент поступает во благо народа. На самом деле попирается любое право. Законы для власти просто неписаны. Те же права профсоюзов. Они — неотъемлемая часть прав человека. Профсоюз, как и человек, не может существовать вне правового поля. Если законы не соблюдаются, профсоюзная деятельность во многом теряет смысл.

— Нахождение в оппозиции — это принципиально?

— Мы были в оппозиции при правительстве Кебича, и тем более мы в оппозиции сейчас, когда попираются все законы. Мы будем в оппозиции даже тогда, когда к власти придут демократические партии. Потому что профсоюз по своей сущности — это оппозиционная организация. За нами и с нами —самые и социально, и в правовом смысле незащищенные люди, люди наемного труда. Если мы не будем в оппозиции, то придется умалчивать о всех тех нарушениях законов, той несправедливости, которая есть у нас как на предприятиях, так и в целом в стране. Зная об этом, разве можно быть равнодушным? Другое дело — в какой находиться оппозиции. Сегодня мы непримиримы не по своей воле. К нынешней власти быть в конструктивной оппозиции, несмотря на все наше старание, не получается. Но и сломать нас не удастся.

В заключение нашего разговора Сергей Ободовский сообщил, что на 26 апреля (Чернобыльский Шлях) и 1 мая готовится в городе и в Минске нечто неожиданное, причем не только для властей, но и для сил охраны общественного порядка. Сказано это было, правда, с улыбкой — от сердца отлегло. Остается только надеяться, что и охрана не переступит границ дозволенного. А Сизифов труд оппозиционеров когда-нибудь (а лучше бы скоро) принесет плоды.

Саша ГЖЕЛЬСКАЯ.

Желание народа — это святое



А.Лукашенко: "Народ просит диктатуры, хочет возврата к сталинским порядкам". (З выступлення на рэспубліканскай селектарнай нарадзе.)

Зварот журналістаў да генпракурора

Напрыканцы мінулага тыдня ў Мінску адбылося паседжанне рады Беларускай Асацыяцыі журналістаў (БАЖ) —нядаўна ўтворанай арганізацыі дэмакратычных работнікаў СМІ і выдаўцоў. Рада разгледзела шэраг пытанняў сваёй дзейнасці ў сувязі з апошнімі падзеямі ў Беларусі, якія непасрэдна закранаюць становішча сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў. Абмеркаванне гэтага пытання завяршылася прыняццем Заявы Генеральнаму пракурору рэспублікі аб масавых парушэннях з боку праваахоўных органаў у дачыненнях з журналістамі, аб грубым умяшальніцтве ў іх прафесійную работу і недапушчальных перашкодах у выкананні імі сваіх абавязкаў.

Да Заявы прыкладзены ліст з больш чым 20-ю імёнамі журналістаў, беларускіх і замежных, якія непасрэдна пацярпелі ад АМОНу і міліцыі падчас масавых мерапрыемстваў, прысутнасць на якіх з'яўляецца неад'емным правам работнікаў СМІ. Пры гэтым у Заяве падкрэсліваецца, што Беларусь далучылася і паставіла свой подпіс пад міжнароднымі пагадненнямі і канвенцыямі, якія гарантуюць у краіне свабоду здабывання і распаўсюджвання інфармацыі, службовую абарону журналістаў. Пракурору даводзіцца элементарная рэч: не журналісты арганізуюць і праводзяць розныя мерапрыемствы, акцыі, шэсці або мітынгі. Яны прысутнічаюць на іх з мэтай даведзення да грамадскасці інфармацыі.

Апошнім часам нацкаваная ўладамі на дэманстрантаў і ўдзельнікаў мітынгаў міліцыя паводзіць сябе жорстка да ўсіх, хто трапляе пад дубінку, і асабліва нецярпіма да людзей з фота- і відэакамерамі, дыктафонамі і магнітафонамі ў руках.

У гэты ж дзень у Мінску кіраўніцтвам БАЖ была праведзена прэс-канферэнцыя. Прэзідэнт Асацыяцыі Жана Літвіна распавяла аб сваёй паездцы ў Маскву падчас спробы Лукашэнкі заключыць з Ельцыным дамову, схаваную ад грамадскасці абедзьвюх краін, што хутчэй нагадвала схему заключэння сумна вядомай і злачыннай дамовы па-за спінамі народаў, што ў свой час падпісалі Молатаў і Рыбэнтроп. З Масквы Ж.Літвіна прывезла шэраг дакументаў, якія сведчаць аб падтрымцы з боку журналістаў Расіі пазіцыі і дзейнасці дэмакратычных журналістаў і сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, салідарнасці з імі ў барацьбе за свабоду слова. На прэс-канферэнцыі, у прыватнасці, прагучала заява Саюза журналістаў Расіі і Фонда абароны галоснасці пад красамоўнай назвай "Не позволим перенести "белорусский опыт" в Россию!"", а таксама сумесны салідарны зварот да беларускіх калег Фонда абароны галоснасці (Масква), Арганізацыі "Рэпарцёры без межаў" (Парыж) і Камітэта абароны журналістаў (Нью-Ёрк).

Паказальны факт: прэс-канферэнцыю занатоўвалі тэлебачанне з НТВ і тэлеагенства "REUTER", замежныя журналісты з Расіі, Францыі, Літвы, Украіны, Германіі, Польшчы. Афіцыйныя беларускія сродкі інфармацыі дазволу на яе асвятленне, відаць, не атрымалі.

Г.Суднік, старшыня Магілёўскай арганізацыі БАЖ.

Дыктатура: хроніка падзей і фактаў (няпоўная)

21 жніўня. Прэзідэнт выдае ўказ, па якому прыпыняе дзейнасць Свабодных прафсаюзаў, а заадно ліквідуе і дэпутацкую недатыкальнасць.

12 верасня. Беларускія войскі проціпаветранай абароны збілі паветраны шар, які ўдзельнічаў у спартовай міжнароднай гонцы. Загінулі два грамадзяніны ЗША.

11 кастрычніка. Прэзідэнцкая адміністрацыя забараніла друкаванне трох незалежных газетаў: "Имя", "Белорусская деловая", "Народная воля".

28 лістапада. У інтэрв'ю нямецкай газеце "HANDELSBLATT" Лукашэнка заявіў, што гітлераўскі парадак "соответствует нашему пониманию президентской республики и роли в ней президента".

1996 г. 24 сакавіка. Каля 30 тысяч чалавек узяло ўдзел у шэсці і мітынгу з нагоды 78-х угодкаў БНР. Напрыканцы дня спецназ учыніў сапраўднае пабоішча. Затрыманых працягвалі жорстка збіваць у пастарунках. Шмат людзей атрымалі моцныя пашкоджанні. Напачатку красавіка быў арыштаваны паэт і журналіст С.Адамовіч за публікацыю ў віцебскай газеце "ВЫБАР" верша "Убей президента". (Суд над ім не завершаны. Выпушчаны нядаўна "пад падпіску", ён зноў арыштаваны ў Менску падчас падзеяў 2 красавіка).

26 красавіка. На "Чарнобыльскі Шлях" у Менску выйшла каля 50 тысяч дэманстрантаў. Звыш 100 чалавек пацярпелі ад спецназа. Больш за 200 чалавек затрымана. Арыштавана амаль усё кіраўніцтва Народнага Фронту.

30 красавіка. Быў затрыманы адзін з кіраўнікоў Партыі аматараў піва А.Рамашэўскі. Толькі праз тыдзень следчыя "выбралі" яму справу: удзел у студэнцкай акцыі 24 траўня 1995 года(?!).

9 траўня. На падыходзе да помніка Перамогі амонаўцы выраалі нацыянальны сцяг з рук прафесара М.Савіцкага і груба абразілі членаў Дэмакратычнага аб'яднання ветэранаў.

14 траўня. Прэзідэнцкія спецслужбы затрымалі дэлегацыю польскай "Салідарнасці" і дэпартавалі яе з Беларусі. Тым часам, у турме на Валадарскага, зняволеныя за ўдзел у "Чарнобыльскім шляху" Ю.Хадыка і В.Сіўчык працягвалі трымаць галоўку пратэсту ўжо 20-я суткі. Таксама абвясцілі галадоўку арыштаваныя за ўдзел у "Шляху" грамадзяне Украіны.

4 чэрвеня. У Менску прайшла акцыя пратэсту супраць утрымання за кратамі сямі ўкраінскіх і двух беларускіх палітзняволеных (С.Адамовіча і А.Рамашэўскага). Спецназ жорстка збіў удзельнікаў і выпадковых сведкаў. Больш за 100 чалавек было арыштавана. Асуджаны на тэрмін ад 3 да 15 сутак і пакараны штрафамі — 77 чалавек. Менавіта тады адседзеў 4 сутак за кратамі інвалід другой групы А.Лісун, глуханямы з дзяцінства. На судзе яго абвінавацілі ў тым, што ён "...выражался нецензурной бранью, выкрикивал антипрезидентские лозунги..."

14 чэрвеня. Міліцыянты абстралялі з аўтаматаў машыну дэпутата Вярхоўнага Савета В.Ганчара. Была параненая ягоная памочніца.

23 жніўня. Іміграцыйныя службы ЗША прадаставілі палітычны прытулак на неабмежаваны тэрмін лідэру БНФ З.Пазьняку і прэс-сакратару фронта С.Навумчыку. Пасля скасавання СССР гэта першы выпадак, калі грамадзянам поставецкай дзяржавы дадзены прытулак у ЗША з прычыны палітычных праследаванняў.

30 жніўня. Беларускамоўная радыёстанцыя "РАДЫЁ 101,2" была адключана ад эфіру па "тэхнічных прычынах". Пазней сам Лукашэнка даваў іншую фармулёўку: "за антигасударственную палитику".

16 кастрычніка. Каля 50 актывістаў Незалежнага прафсаюза выйшлі з Салігорска з мэтай патрапіць ў сталіцу і ўзяць удзел у мітынгу супраць дыктатуры. За тры дні паходу яго ўдзельнікаў затрымлівалі і судзілі пяць разоў.

21 кастрычніка. У цэнтры Менска быў абстраляны аўтамабіль, у якім павінен быў ехаць на працу намеснік старшыні ВС Г.Карпенка.

2 лістапада. Была арыштаваная журналістка газеты "ЗДРАВЫЙ СМЫСЛ" Ц.Клыкоўская. Падстава — тэма яе тагачаснай працы: праварадыкальныя арганізацыі.

15 лістапада. Прэзідэнт незаконным указам зняў з пасады старшыню Цэнтральнай выбарчай камісіі, дэпутата ВС В.Ганчара.

16 лістапада. Памежнай службай быў затрыманы надрукаваны ў Літве спецвыпуск газеты "НАША НІВА".

17 лістапада. У Менску прайшоў "Марш з закрытымі ртамі", які выліўся ў масавую акцыю падтрымкі парламента і дэманстрацыю пратэсту супраць неканстытуцыйных дзеянняў прэзідэнта. Было збіта некалькі дзесяткаў дэманстрантаў, у т.л. пацярпелі дэпутаты В.С.

У знак пратэсту супраць намечанага рэферэндуму і нязгоды з эканамічным курсам прэзідэнта падаў у адстаўку прэм'ер-міністр М.Чыгір.

24 лістапада. У час правядзення так званага "рэферэндума" былі зафіксаваныя факты збіцця назіральнікаў і незалежных журналістаў, якія былі сведкамі шматлікіх фальсіфікацый.

3 снежня. У Лісабоне на саміце АБСЕ недэмакратычныя паводзіны беларускіх уладаў і вынікі лістападаўскага рэферэндума былі падтрыманыя толькі дэлегацыяй з Расіі.

8 снежня. Больш за 20 чалавек былі арыштаваны ў Менску пасля антыпрэзідэнцкай дэманстрацыі.

10 снежня. 15 чалавек былі арыштаваныя ў сталіцы пасля пікета, прысвечанага Дню правоў чалавека.

1997 г. 14 студзеня. Старшыня праўлення Нацбанка Т.Віннікава арыштаваная і дастаўленая ў следчы ізалятар КДБ.

19 студзеня. Арыштаваныя найбольш актыўныя ўдзельнікі забастоўкі на Камароўскім рынку сталіцы.

27 студзеня. Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы прыняла рашэнне аб спыненні на нявызначаны тэрмін статусу Беларусі як спецыяльна запрошанай краіны.

Напрыканцы студзеня. Менскі гарвыканкам увёў цэнзуру на правядзенне мастацкіх выставаў.

Міністэрства юстыцыі ў чарговы раз адмовіла Беларускаму Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў у рэгістрацыі.

Дыктатура: хроніка падзей і фактаў (няпоўная)

Неадназоава затрымліваліся актывісты БНФ "за правядзенне несанкцыянаванага пікета" каля расійскага пасольства.

Місіі Еўрапейскага Саюза, якая вывучала становішча ў Беларусі, было адмоўлена ў сустрэчы з экс-старшынёй Нацбанка, якую працягвалі ўтрымліваць за кратамі.

11 лютага. Куля з дробнакаліберна́й зброі прабіла дзве шыбіны і прайшла праз тое месца ў доме галоўнага рэдактара "СВАБОДЫ", дзе ён звычайна працуе.

Вечарам у пад'ездзе свайго дома невядомымі быў збіты дэпутат ВС А.Лябедзька.

14 лютага. У дзень святога Валянціна ў Менску падчас маладзёжнага шэсця "Беларусь — у Еўропу" міліцыя ўжыла акрамя дубінак слезацечны газ і электрашокеры. Арыштавана каля 40 чалавек.

2 сакавіка. Пасля святкавання Дня горада ў Менску затрымана каля 30 чалавек.

5 сакавіка. Гродзенскі гаспадарчы суд прыняў рашэнне выселіць з памяшкання рэдакцыю газеты "ПАГОНЯ" разам з беларускімі грамадскімі арганізацыямі.

У польскага журналіста А.Путыя беларускія памежнікі адабралі ўсе запісы і матэрыялы, звязаныя з парушэннямі правоў чалавека ў Магілёве.

6 сакавіка. Апублікаваны прэзідэнцкі дэкрэт N 5, у адпаведнасці з якім практычна любая акцыя (у т.л. санкцыянаваная) можа быць разагнаная міліцыяй.

10 сакавіка. Звыш 100 дэманстрантаў арыштавана і 5 чалавек паранена міліцыяй падчас акцыі пратэсту з нагоды прыезду ў Менск расійскай парламенцкай дэлегацыі.

12 сакавіка. Пракурор Менска М.Купрыянаў паведаміў аб узбуджэнні крымінальных спраў па фактах правядзення акцыяў 14 лютага, 1 і 10 сакавіка.

13 сакавіка. Пасля вобыску ў штаб-кватэры БНФ гвалтоўна захоплены прафесар Ю.Хадыка. Днём пазней ён быў асуджаны на 5 сутак, нягледзячы на тое, што ніводнае абвінавачанне супраць яго не было даказанае.

14 сакавіка. Масавыя затрыманні людзей адбыліся ў раёне плошчы СВАБОДЫ. Такім чынам улады не дапусцілі шэсця "Беларусь — у Еўропу-2". Хапалі ўсіх без разбору. Сярод некалькіх сотняў затрыманых апынуліся шмат журналістаў, а таксама былі дзеці ва ўзросце 12-13 год.

Пасля 15 сакавіка.

За ўдзел у шэсці, прысвечаным Дню Канстытуцыі, былі пакараныя штрафамі вядомыя палітыкі, сярод якіх — тры апошнія спікеры ВС.

Менская пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу супраць непаўналетніх С.Пецюкевіча і П.Корзуна, якіх абвінавачаць ў зрыванні "государственных флагов РБ".

16 сакавіка. Улады адмовілі выканаўчаму дырэктару Беларускага фонда Сораса П.Бэрну ва ўездзе ў нашую краіну.

17 сакавіка. Дзяржсакратар Савета бяспекі В.Шэйман загадаў праверыць фінансава-гаспадарчую і іншую дзейнасць БФС. Аналагічныя захады супрацоўнікі Савета бяспекі ўжываюць у дачыненні да іншых дабрачынных фондаў і грамадскіх арганізацый.

20 сакавіка. Падчас акцыі "Студэнцкі пратэст" менская міліцыя арыштавала каля 30 чалавек, у т.л. выпадковых прахожых. Быў затрыманы дэпутат ВС П.Знавец, старшыня Сацыял-дэмакратычнай партыі М.Статкевіч, маладзёжны лідэр С.Марцалёў і журналіст П.Карназыцкі. Усе яны былі пакараныя "суткамі".

23 сакавіка. Падчас святкаванняў апазіцыяй Дня Волі — 79-х угодкаў БНР — адбыліся напады АМОНу на дэманстрантаў. Было арыштавана, па розных звестках, ад 100 да 200 чалавек, у т.л. экс-міністр унутраных спраў і намеснік старшыні ВС. Міліцыя затрымала таксама першага сакратара амбасады ЗША С.Аляксандрава. Улады аб'явілі амерыканскага дыпламата персонай нон-грата.

Напрыканцы сакавіка.

Міністэрства замежных справаў пазбавіла акрэдытацыі дырэктара карэспандэнта расійскай тэлекампаніі НТВ А.Ступнікава. Яму было загадана пакінуць тэрыторыю Беларусі да 1 красавіка.

Старшыня Белтэлерадыёкампаніі Р.Кісель забараніў пускаць у будынак тэлебачання расійскіх тэлежурналістаў, каб яны не мелі магчымасці "пераганяць" свае матэрыялы ў Маскву.

На беларуска-літоўскай мяжы ў карэспандэнта НТВ была канфіскаваная касета з тэлерэпартажам пра падзеі ў Менску.

2 красавіка. Пасля мітынгу пратэсту супраць падпісання ў Маскве чарговага "аб'яднальнага" пагаднення міліцыянты распачалі сапраўдную бойку паблізу ад пасольства Расіі. Былі па-садысцку збітыя жанчыны, дзеці, моладзь, старыя. Пацярпелі, як заўсёды, журналісты. У гэты дзень "ахоўнікі парадку" схапілі больш за 150 чалавек.

Працяг будзе...

Хроніку сталічных падзей і фактаў занатаваў супрацоўнік рэдакцыі П.Станчык.

P.S. Існуе, вядома, меншая па аб'ёму, але не менш красамоўная і пераканаўчая МАГІЛЁЎСКАЯ ХРОНІКА. Мы гатовы яе апублікаваць па прадстаўленні мясцовай арганізацыі Беларускага Хельсінскага Камітэта.

Д.Сорас. Кнігі серыі "Адкрытае грамадства"

Наша ўлада, якой у вызначэнні паняцця дэмакратыі падабаецца толькі адно слова — "ўлада", абвінаваціла Беларускі фонд Сораса ў падрыўной ідэалагічнай і ледзь не палітычнай дзейнасці. Вядома, што гэта абсалютная пухта: чатыры тысячы шчаслівых валадароў сорасаўскіх грантаў могуць гэта з лёгкасцю абвергнуць. Але хто ў нас слухае каго-небудзь, калі меркаванне не з'яўляецца афіцыйным?! А вызначыць сваё, асабістыя адносіны да таго, што робіць фонд у нашай краіне, можна, мінуючы тлумачэнні БТ і ўласцівую нам падазронасць. Для гэтага трэба зайсці ў нармальную кнігарню і, калі пашанцуе, набыць адну, а лепш усе кнігі сорасаўскай серыі "Адкрытае грамадства", выдадзеныя на беларускай мове. Каштуюць нядорага — ад дзесяці тысяч "зайчыкаў". Падумалася, каб не самы надзейны наш мытнік —мова, сплылі б гэтыя выдатныя кніжкі ў Расію і можна было б на іх нядрэнна зарабіць. На шчасце, іх яшчэ можна ў нас купіць. Што я і зрабіў.

Не ўстаяў перад "ФІЛАСОЎСКІМ ЗДУМЛЕННЕМ" французскай аўтаркі Жаны Эрш. Маркс, Кіркегор, Ніцшэ і іншыя знакамітыя імёны філасофскага аналізу парыжскай прафесаркі прыцягнулі нетрадыцыйнасцю погляду, смеласцю і доказнасцю меркаванняў, а таксама шырокім прадстаўленнем слова тым, аб кім ідзе ў кнізе гаворка. А як прыгожа, як дакладна гучыць гэта па-беларуску: здумленне, развой, атачэнне, моўкнасць. Чытаць такую кнігу асалода: і філасофія тут — маці ўсіх навук — і мова выдатная!

Другой спакусай для мяне з'явілася кніга прафесара сацыялогіі Лонданскага універсітэта Энтані Сміта "НАЦЫЯНАЛІЗМ У ХХ СТАГОДДЗІ". Заінтрыгавала фраза з анатацыі: "кніга разлічана на рэшткі інтэлектуалаў". Цікава ўсё ж, што мне, простаму абывацелю, не трэба ведаць аб з'яве, аб якой я з палітычных навін і каментароў да іх газет, радыё, тэлебачання ведаю амаль столькі ж, колькі аб мыле "Сэйфгард", ці "лепшым сябры малышоў"?!

Дадайце сюды яшчэ дзесяцігоддзі —разам з мільёнамі савецкіх людзей працаздольнага ўзросту — абавязковае цяпельканне ў сетках палітвучобы.

Такім чынам, "тэст" на інтэлектуальнасць. Што такое нацыяналізм? Гэта:

а) мяккая форма фашызма, расізма, камунізма;

б) першы крок на шляху вайны і генацыду;

в) ідэалагічны рух па дасягненню і замацаванню аўтаноміі, адзінства і індывідуальнасці сацыяльнай групы — рэальнай ці патэнцыяльнай нацыі.

Не спяшайцеся адказваць. "Адзіна правільны" адказ на гэтае пытанне, якому навучыла нас камуністычная прапаганда, на самой справе такім не з'яўляецца. На жаль, мы так мала ведаем сапраўднай навукі, міжнароднай практыкі, прызнанага ў свеце вопыту. І так рэдка над гэтым думаем, збядняем сябе. І таму так часта мы, грамадства, памыляемся, робячы свой выбар і даючы сваю ацэнку падзеям.

А вось змест трэцяй сорасаўскай кнігі — "Дапаможнік для журналістаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы", складзенай групай вядучых амерыканскіх выдаўцоў і журналістаў, выклікаў у мяне сумненне. Спадзяваўся, што "акулы прадажнай прэсы" шчыра раскрыюць сакрэты, як ім удаецца рабіць свой бізнес на вельмі вузкім коле тэм: свецкая хроніка, інтымнае жыццё галівудскіх зорак, паходжанні мафіёзных каралёў і г.д. А што атрымаў? Цытую: "для газет Злучаных Штатаў існуюць дзве галоўныя сферы асвятлення падзей: бізнес і адукацыя... У рэдактараў і рэпарцёраў павінна быць сапраўдная манія дакладнасці... Скептычна ўспрымайце любую інфармацыю... Рабіце ўсё магчымае, каб даць слова розным бакам спрэчкі... Не бярыцеся за матэрыял, калі вы маеце фінансавы ці асабісты інтарэс... Ніколі не бярыце грошай ці падарункаў ад асобаў ці арганізацый, пра якіх пішаце або будзеце пісаць... Не станавіцеся на бок рэкламадаўцаў, высокапастаўленых асобаў, групаў падтрымкі... Добрая газета адлюстроўвае жыццё грамадства, добрае яно ці благое... Роля газеты ў дэмакратычным грамадстве заснавана на прынятых ёю абавязках забяспечваць выбаршчыкаў інфармацыяй, неабходнай для грамадскіх акцый... "Вось, сказваецца, якімі маральнымі і прафесійнымі прынцыпамі павінны кіравацца сапраўдныя цывілізаваныя прафесіяналы пяра, магнітафона і тэлекамеры. Як бачым, ні пра якае "правільнае служэнне народу", "тлумачэнне і падтрымку палітыкі дзяржаўнага кіраўніцтва, што нястомна клапоціцца аб народзе" і г.д. і гаворкі няма.

Калі назіраю за тым, як абсалютная большасць з нас набывае ў шапіках газеты ў якасці дадатку да тэлепраграмы, раблю высноу, што ўсім нам ад журналістыкі, якая пакорліва абслугоўвае ўладу, да нармальнай журналістыкі гэтак жа далёка, як цяперашняй Беларусі да сапраўднай Беларусі.

На жаль, не магу выказаць меркаванні наконт іншых кніг з гэтай сорасаўскай серыі. Не заўсёды магу з лёгкасцю патраціць на іх грошы. Але ўдзячны і тым выданням, якія здолеў набыць. І тым, якія яшчэ папоўняць маю бібліятэку, калі толькі Фонд Сораса не згорне ў Беларусі сваю дзейнасць. Магчыма, гэта не станецца трагедыяй. Але страту цывілізаванасці і свядомасці грамадства безумоўна нанясе.

Марк ШЛЯФЕР, магілявчанін.

С милицией может поспорить только горисполком

По мнению могилевских участников ПРАВОЗАЩИТНОЙ КОНВЕНЦИИ, которая создана в прошлом месяце в Республике Беларусь, в деле нарушения прав и свобод человека с милицией у нас может поспорить только горисполком. За ним правозащитники областного центра за последние год-два числят не менее десятка незаконных решений, ограничивающих права и свободы как отдельных граждан, так и целых общественных организаций. И это, по мысли правозащитников, более серьезно, чем собственно милицейские нарушения, поскольку последние в ряде случаев действуют не по собственной инициативе, а выполняя исполкомовские распоряжения.

И хотя горисполком — орган, как известно, коллективный, правозащитники фиксируют персональные имена тех, кто инициирует запреты, проявляет личное непримиренное отношение к отдельным организациям или к их представителям. (Такое отношение, допустимое в частном порядке, —все мы люди — нетерпимо, когда речь идет о лице, исполняющем государственную должность). Наиболее часто в этом "разделе" зафиксированы имена зам. председателя горисполкома В.Цумарева и председателя Ленинского райисполкома В.Полякова.

Сейчас, после вступления в действие президентского декрета № 5, у правоохранительных органов и власти появилось еще больше возможностей для ужесточения своих действий против демократии и свободы. Однако правозащитники, а членами конвенции стали 13 могилевских общественных организаций, считают, что декрет не соответствует обязательствам Беларуси, взятым ею на себя после подписания целого ряда международных Соглашений, Пактов и Деклараций. А все свои материалы участники Правозащитной конвенции имеют ввиду предавать огласке как в стране, так и в мире.

Они верят, что рано или поздно эти факты лягут в основу судебных претензий к тем, кто сейчас, в центре Европы, своими личными действиями способствует укреплению белорусской разновидности диктатуры, осужденной во всем мире.

Они не теряют надежды на возврат нашей страны в поле демократии, свободы и прав человека.

Соб. инф.

По старонках беларускага замежнага друку

Ліст з Аўстраліі

Гэты ліст быў дасланы ў рэдакцыю газеты "БЕЛАРУС", якую выдае ў Злучаных Штатах Асацыяцыя Беларусаў Амерыкі. Як пазначыла рэдакцыя, "...і ліст, і артыкул... выдатна адлюстроўваюць лёс нашага расьцярушанага народу і нацыянальную трагедыю..."

Мы вырашылі перадрукаваць гэты ліст цалкам, не падзяляючы яго на "ліст" і "артыкул", як у "БЕЛАРУСЕ", і таму выпускаем з арыгіналу толькі адзін сказ. На нашую думку, разважанні чалавека, які шмат гадоў адарваны ад радзімы, але захаваў не толькі памяць і любоў да яе, а і родную мову — вартыя таго, каб стаць вядомымі чытачам. На жаль, прозвішча карэспандэнта газета не паведамляе. Да нас нумар амерыканскай газеты патрапіў з музея.

Я пастанавіў што-небудзь напісаць да Вас. Я нарадзіўся ў вёсцы Лукашына, што 18 км ад Навагрудку. У 1942 годзе нас вывезьлі ў Нямеччыну — мне было тады 11 гадоў. Мы ўжо болей не пабачылі Беларусь. У 1946 годзе праз памылку мой бацька завёз нас у Польшчу. Пашчасьціла нам, што нас польская ўлада не заўважыла, як непрыяцеляў савецкай улады. У 1973 годзе ўдалося нам: мне, маёй жонцы і сыну — паехаць у Францыю да сваякоў на візыту. Там мы і засталіся, як уцекачы. З Францыі мы паехалі ў Аўстралію.

Я праз школы прывучаны быў да ўсяго, што польскае. Нават з жонкаю-полькаю мы дома гаворым папольску. Аднак, я Беларус, і мне вельмі душа баліць, калі гэты чалавек, так званы прэзыдэнт, Лукашэнка, як факты паказваюць, пастанавіў зьліквідаваць нашую Беларусь. На гэта ня можна глядзець бязчынна.

Калі рэферэндум на Беларусі на апрабату новае лукашэнкаўскае канстытуцыі ня прызналі важным усе дэмакратычныя сілы на сьвеце, дык што можна думаць аб усіх папярэдніх лукашэнкаўскіх выбарах. Сама сабою насоўваецца думка, калі ўсе папярэднія выбары былі такою самаю ФАЛЬШЫЎКАЙ, як і апошнія, дык тады Лукашэнка ёсьць не легальным прэзыдэнтам Беларусі, а толькі расейскім самазванцам на беларускі прэзыдэнцкі трон. Мы, беларусы, маем права так думаць, бо за Лукашэнкам адыйшла на дальні плян беларуская нацыя, яе мова і культура, а таксама беларуская сымболіка "Пагоня", якая мае пачаткі ад Вялікага Княства Літоўскага. Беларускі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг таксама адкінуты. Усім на сьвеце відавочна, што Лукашэнка даводзіць беларускую дзяржаву і яе нацыю да блізкае ліквідацыі. Інтэграцыя з Расеяй гэта ўжо апошні этап ліквідацыі Беларусі, зьнішчэньня яе самастойнасьці. Усе беларусы павінны падумаць аб гэтым і не дапусьціць забойства сваёй нацыі.



Гэты калажны твор быў выстаўлены ў Менску на рэспубліканскай мастацкай выставе суполкі "Пагоня". Загадам міністра культуры дэманстрацыя калажу была забаронена. А чаму? Адлюстраваны нашы кіраўнікі, паважаныя і знакамітыя людзі. Аб'яўляем конкурс "Хто ёсць хто?" Адказы, каб не спрацаваў выпадкам дэкрэт N 5, раім даваць самім сабе.

Пачварныя "старонкі мужнасці"

Колькі каштуе жыццё чалавека? А калі гэты чалавек — дзіця? Пытанне... Летась у адной з магілёўскіх газет пад рубрыкай "СТАРОНКІ МУЖНАСЦІ" быў надрукаваны артыкул ветэрана вайны Івана Бяляева "Аперацыя "Стол". Сутнасць расповяду гэткая...

Жыў у вёсцы Нядашава сталяр-чырвонадрэўшчык Якаў Арлоў, і напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны пачаў ён майстраваць інкруставаны дзевюхтумбавы стол у падарунак Савецкаму ўраду. Аднак завяршыць работу перашкодзіла вайна.

Калі прыйшлі фашысты, яны загадалі майстру закончыць працу над сталом. Аб гэтым даведаліся партызаны і вырашылі перашкодзіць вывазцы стала ў Нямеччыну. Цёмнай лютаўскай ноччу 1943 года народныя мсціўцы забралі "цуда-стол" і адправілі ў Маскву ў суправаджэнні Арлова.

Стол-та забралі, а вось сям'ю майстра чамусьці не дадумаліся. У выніку сям'я Арлова — жонка і трое дзетак — былі схопленыя і расстраляныя. Як піша Іван Бяляеў, цудам выратавалася толькі адна дачка...

Артыкул ветэрана вытрыманы ў духу гераічнага пафасу, прасякнуты замілаваннем мужнасцю народных мсціўцаў, якія "стомленыя, але шчаслівыя... вярнуліся ў лагер..." Але ў мяне гэты расповяд выклікаў адно толькі пачуццё горычы за бязвінна загінуўшых дзяцей і іхнюю маці. Яны сталі ахвярамі фашыстаў не без "дапамогі" сваіх абаронцаў-партызанаў. Самы час узгадаць радкі верша "Партызаны" вядомай беларускай паэткі Ларысы Геніюш:

Партызаны ж, тыя партызаны,
Што ім сёлы, боль і енк людзкі,
Толькі б мосьцік недзе быў узарваны,
Ды зьляцелі з рэйкаў цягнікі.
Што для іх адкрытыя магілы.
Гдзе за рэйкі кідалі дзяцей,
Не, дзяцей яны не баранілі,
Солтыса забіць куды прасьцей.
Солтыса, які акручваў немца,
Каб ад згубы ратаваць сяло.
Бо куды ж было народу дзецца,
Помачы вокуль чакаць было?
Нашы пушчы, роднае багацьце,
Непралазнасць зарасьляў, балот
Партызанам ёсьць куды схавацца,
А куды ж схаваецца народ?
А куды схаваюцца мільёны
Ў кінутай нашэсьцю старане,
Дзеці ў гэтых сёлах безбаронных
Калі ўсе мужчыны на вайне?

Па мне (думаю, са мной пагадзіліся б многія) дык гары ён гарам, гэты стол, калі за яго трэба плаціць гэткую страшную цану. А паспрабуйце сабе ўявіць, што ж рабілася ў душы Якава Арлова пасля такога гераічнага выратавання ягонага "цуда-стала"?! Пэўна, усё астатняе жыццё чалавек бачыў перад сабой вагі, на якіх, з аднаго боку — "цуда-стол", а з другога — жыцці жонкі і дваіх дзетак.

Магчыма, хтосьці абурана скажа: "На каго руку падняў? На герояў-партызанаў?" Адкажу. Не аспрэчваю я подзвігі народных мсціўцаў. Нямала пра іх чытаў і чуў ад старых людзей. Але ці варта бяздумна і бяздушна тыражаваць успаміны аб пачварных эпізодах, выдаючы іх за гераічныя? Але дзеці, што маглі б жыць, а пайшлі на той свет з-за нейкай драўлянай скрыні?! Мне здаецца, гэта ўжо "старонкі мужнасці" з нейкім нялюдскім абліччам.

Юрась ПІВУНОЎ.

Беларуская служба Радыё Свабода

Новыя хвалі, пастаянны час, нязменная Свабода

(з 30 сакавіка 1997 г.)

Час	KHz	Хвалі
18:00-19:30	6105	49
	7295	41
	11725	19
22:00-23:30	6105	49
	7295	41
	9750	31
06:00-07:00	6065	49
	7295	41
	9750	31

Паштовы адрас: 220005, Мінск-5, п/с 111

Заставайцеся са "СВАБОДАЙ"!

Актывісты вучыліся лідэрству

Грамадскія аб'яднанні канаюць не таму, што мэты ў іх дрэнныя, а па прычыне няўмелай арганізацыі, дрэннага кіраўніцтва і адсутнасці грошай. Гэтая думка некалькі разоў гучала з розных вуснаў падчас правядзення ў Магілёве двухдзённага семінара "Дэмакратычнае лідэрства. Пошукі рэсурсаў".

Аказваецца, аб'яднацца ў нейкую суполку, зрабіць нешта добрае і пры гэтым не разваліцца, не пасварыцца адзін з адным — гэта вялікая навука, якой вучацца не толькі ў нас, а і на Захадзе. Існуюць цэлыя цэнтры і інстытуты, што вывучаюць гэтую праблематыку, а потым укараняюць свае напрацоўкі ў грамадскае жыццё. Як псіхолаг патрэбны на якімсьці заводзе для вырашэння нават чыста заводскіх праблем, як аўдытар неабходны фірме, каб ведаць аб'ектыўны стан яе дзейнасці, гэтак жа і грамадскім арганізацыям, а дакладней іх членам, бывае вельмі карысна паслухаць інструктараў ці трэнераў згаданых цэнтраў, каб узбагаціць уласны вопыт і нават даведацца аб нечым новым. Усё гэта дазволіць потым больш дакладна і дасканала працаваць.

У нашым выпадку семінар разглядаў пытанні адной з найгалоўных праблем жыцця арганізацыі — лідэрства. Як лідэр існуе ў атачэнні сваёй "паствы", як ужывацца двум лідэрам разам, як весці за сабой людзей, аб чым непакоіцца і на што не зважаць, — цэлы шэраг падобных пытанняў абмяркоўвалі ўдзельнікі семінара. Часцяка пытанні тычыліся канкрэтных выпадкаў з жыцця. Напрыклад адзін з удзельнікаў потым прызнаўся карэспандэнту "ТМ", што зразумеў памылку, у выніку якой ягоная арганізацыя існуе больш года, а вынікаў мала. Аказваецца, ён, лідэр, палічыў, што, сабраўшы добрых людзей на добрую справу, выканаў свой галоўны абавязак і цяпер можа проста чакаць ініцыятывы сваіх сяброў.

Другім пытаннем семінара быў пошук грошай, "па-замежнаму" фондрэйзінг. Можна быць якім заў-годна разумным, мець самыя амбітныя планы, але без сродкаў нічога не зрабіць. Трэба іх шукаць. І трэба ЎМЕЦЬ іх шукаць. Вы шукаеце сродкі не ў сваю кішэню, а прапануеце сапраўдны тавар — уласную ідэю, вопыт па яе ажыццяўленні, свае фізічныя, інтэлектуальныя і духоўныя намаганні. Калі вашы пажаданні супадаюць з пажаданнямі патэнцыйнага фундатара, — грошы будуць. Была б ідэя сапраўды шчырая і добрая.

Семінар праводзілі Інстытут падтрымкі дэмакратыі ва Усходняй Еўропе, фундацыя "Адукацыя на карысць дэмакратыі" (абодва з Польшчы) і беларускі цэнтр "Супольнасць". Падзіла семінар гарадская асацыяцыя "Кола сяброў", а ўдзел у ім бралі актывісты маладзёжных суполак Магілёва, ды госці са Шклова, Глуска і Чавусаў. Прадстаўнікі фундатараў і адначасна вядучыя семінара Павел Казанецкі (Варшава), Алесь Міхалевіч, Кастусь Хадыка (Мінск) і Макс Чарнэўскі (Варшава) адзначылі, што першы ў Магілёве семінар паказаў неабходнасць надання большага імпульсу ў развіцці недзяржаўных грамадскіх аб'яднанняў.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН.



Вясной намнога прасцей і ўтульней...

Рок-сустрэчы пры старым каралеўскім тракце

Менавіта такую назву меў Гарадзенскі фэстываль маладых рок-выканаўцаў, які прайшоў там тыдзень назад. Мы паведамлялі, што на гэты фэст з Магілёва ад'ехаў самадзейны гурт LIKE SUISIDE (ТМ N 3). Гарадзенскія прыхільнікі "металічнага" року сустрэлі нашых музыкантаў гучнымі ўсклікамі і апладысментамі. Відаць, у гэтым адлюстравалася і маральная падтрымка з нагоды чарговай забароны ўладаў падобнага фэстывалю, які павінен быў пачацца ў Магілёве 18 красавіка. Не пачнецца. Хаця ў аргкамітэта ўсё, што трэба, было: згода шматлікіх удзельнікаў, грошы на іх размяшчэнне і харчаванне, канцэртная зала, неабходная апаратура і гледачы. Ад улады мы чакалі аднаго: дазволу. Яна не адважылася і на гэта. Што тычыцца Гародні, то магілёўскі гурт стаўся там уладальнікам Дыплома і каштоўнага прыза.

Дзяніс НОВІКАЎ.

Их нравы?

"Это не телефонный разговор"

Всем известно, что в течение десятилетий корпус иностранной прессы в Москве находился под усиленным наблюдением. Журналистов преследовали, осуждали, высылали, а иногда и арестовывали как шпионов.

Хотя представители моего поколения корреспондентов в Москву приехали много времени спустя после того, как Советы уступили свое место "Макдоналдс" и "Баскин Роббинс", а КГБ был реорганизован и переименован, мы унаследовали своеобразную коллективную память об этих временах и соответственно остаточную паранойю: мы, дескать, знаем, что вы нас подслушиваете!

Эта проблема возникает практически на каждом журналистском обеде, и, когда она возникает, мы невольно смотрим на светильник на потолке. Я знаю репортера, 8-летний сын которого регулярно "общается" с люстрой, жалуясь ей на своих учителей. Вечером, когда я усаживаюсь со своей маленькой дочкой, чтобы почитать ей сказки, я часто пытаюсь представить, что же думают те, кто наблюдает за мной, когда я в сотый раз произношу: "Ред, Нед, Тед и Эд уже в кровати".

Вскоре после того, как мы приехали в Москву два года назад, в нашу квартиру пришли какие-то рабочие с небольшим переговорным устройством. Они сказали, что это — элемент системы безопасности, которую планируется установить в доме. Управление нашим блоком дипломатических домов раньше было отделением КГБ и лишь недавно приватизировалось под названием, если я не ошибаюсь, "Дипкомфорт". Система безопасности так и не заработала. Между тем, я пыталась использовать это приспособление для того, чтобы попросить об интервью с президентом России Борисом Ельциным.

Наши русские друзья твердо убеждены, что за журналистами все еще ведется наблюдение. "Это не телефонный разговор", — обычно говорят они, когда ты пытаешься обсудить с ними какую-то новую сплетню. Даже официальные представители правительства иногда так же отвечают на мои вопросы.

После того, как я рассказала сотруднику о визите к нам телефонного мастера, вся деловая активность нашего бюро была перенесена в коридор. В течение трех дней, пока мы раздумывали, что же нам предпринять, мы переговаривались нервным шепотом и обменивались коряво нацарапанными записками.

Наконец мы не выдержали. Мой муж разобрал телефоны. Мы были потрясены обилием пустых мест в этих пластмассовых коробочках. Мы не нашли ничего, что можно было бы явно определить как "жучок". Каждый день моя русская переводчица Алла, нашептывала на технического, русского же сотрудника, что "он из КГБ." На него же и других ворчал и шофер бюро Валерий...

Да, всего лишь несколько лет назад наши переводчики, шоферы, техники, няньки и домработницы направлялись к нам управлением КГБ. Это не были профессиональные агенты, но они были на переднем крае наблюдения и были призваны следить за встречами наших предшественников с диссидентами, а заодно и с любовниками. Теперь мы принимаем на веру, что они больше не работают на КГБ и нас никто не подслушивает.

А может быть, вопрос следует поставить иначе: насколько нужно прослушивать мои разговоры? Через пять лет после того, как Россия обрела свободную прессу, именно ее журналисты рассказывают подлинную правду об этой стране.

Эта статья была опубликована в газете "Филадельфия инкуайер" ее московским корреспондентом Ингой Саффрон. Перевод и распространение ИТАР.

Адказы на крыжаслоў, апублікаваны ў мінулым нумары (3) тыднёвіка

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4. Крумкач. 7. Стадола. 8. Памылка. 9. Старэча. 10. Гадзіна. 14. Каляіна. 16. Хованка. 17. Аброжак. 18. Ручайка. 20. Аблетак. 22. Прыціск. 23. Адзімак. 26. Збажына. 27. Круленя. 29. Айканне. 30. Жыхарка.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Грамада. 2. Пратока. 3. Заплата. 5. Брамнік. 6. Басэтля. 11. Абгавор. 12. Ахрапак. 13. Лагунец. 14. Качулка. 15. Насатка. 19. Міласць. 21. Узлесак. 24. Знайдыш. 25. Прынука. 28. Забаўка.

Тыднёвік Магілёўскі 4

Рэдактар Генадзь СУДНІК

Інфармацыйна-аналітычная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 4. Тыраж 2100 асобнікаў.